# Ад рэдактара

Слова ἀρχή азначае «першапачатак», «першапрычына», «тое, што ляжыць у аснове». Калі яго спекуляцыйна задзіночыць з такімі паняццямі, як ἀνάμνησις (прыгадванне) і ἀλήθεια (праўда), выйдзе наступны абраз: ἀρχή — гэта прыгадванне–праўды–ў–ейнай–спачатнасці. Як прыгадванне–праўды–ў–ейнай–спачатнасці ἀρχή сімвалізуе інтэнцыю здабыць выточны пункт, выходзішча, якім будзе пазначана новае падарожжа.

Заданне часопіса пад назвай ἀρχή палягае не столькі ў тым, каб зграмадзіць — злучыць пад адной страхой — артэфакты айчыннай наратыўнай прасторы, колькі ў тым, каб давесці яе да крытычнай тэмпературы, калі магчымым стаецца ператварэнне лёду ў ваду, вады ў пару, а пары ў агонь. Таму наш часопіс узнікае не ад канстатацыі незадаволенасці *чымсьці*, а ад імпульсу, скіраванага на ператварэнне, трансфармацыю, ад'іначанне. Бо пачасту *знакшыць* азначала не збурыць, паглуміць, а, наадварот, выявіць зваротны бок рэчаў — *накшае, іншае.*

Выпраўляючыся ў дарогу, мы не ведаем, дзе будзе наступнае ўпынішча. — Дый гэта не так важна, таму што ў *нашай* сітуацыі нават блукаць валей, чымся стаяць на адным месцы.

Выходзьце нам насустрач.

Мы маем што сказаць.

* * *

У аснову нумару, які Ты, дарагі чытачу, трымаеш у руках, былі пакладзены дзве скразныя тэмы: «Парнаграфія» і «Лукашэнка». Паспрабуем разам з Табой даць ім хоць якое лагічнае абгрунтаванне.

Часта можна пачуць, што беларускі народ у ходзе свайго гістарычнага развіцця перажыў жудаснае згаленне. Аб тым жа самым сведчаць факты нашай мовы, а менавіта наяўнасць у ёй словаў, якія пазначаюць стан згалення з розных бакоў: галеча, галота, галіта. Згаленне як тэндэнцыя прывяла да таго, што калі ў нас адкрыліся вочы, мы ўбачылі: народ наш *par excellence* голы.

«Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы» — пісаў некалі Мацей Бурачок. Насмелімся дадаць, што вырачэнне сваёй гаворкі, языка ёсць нават не «перапрананнем» душы, а яе «распрананнем». Згаленне працягваецца, душа становіцца наросхрыст.

Лукашэнка ж — гэта апафеоз згалення, згалення, ператворанага ў базавы прынцып існавання. «Грабце мяне, грабце», — крыкма крычыць Лукашэнка.

Парнаграфія, Лукашэнка і шмат іншага чакаюць Цябе, дарагі чытачу, там, наперадзе...

***Валерка Булгакаў***